

# ТЭОРЫЯ, МЕТОДЫКА І АРГАНІЗАЦЫЯ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*М. А. БЯСПАЛАЯ*

## САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У ГІСТАРЫЧНАЙ РЭТРАСПЕКТЫВЕ

*Суадносіны паняццяў вольнага часу, дасугу, адпачынку нас цікавяць перш за ўсё тым, што аб'ядноўвае гэтыя дэфініцыі, а менавіта: сацыякультурная дзейнасць як сродак баўлення вольнага часу ў цэлым, ці арганізацыя сацыякультурнымі сродкамі дасугу, ці проста сродак рэкрэацыі асобы праз адпачынак. У мэтах артыкула – адлюстраванне зараджэння розных форм сацыякультурнай дзейнасці (СКД) на прыкладзе культурных асяродкаў старажытнага свету.*

Эвалюцыя чалавецтва пацвярджае, што ні адзін з відаў дзейнасці чалавека не адбываецца без выкарыстання папярэдняга вопыту. Сказанае адносіцца і да сацыяльна-культурнай дзейнасці, хаця такая дэфініцыя ў навуковай літаратуры і паўсядзённай практыцы стала ўжывацца адносна нядаўна. Узнікненне, станаўленне і развіццё сацыякультурнай дзейнасці сведчаць, што яна з'яўляецца адным з галоўных сродкаў арганізацыі вольнага часу (і яго складніка – дасугу) пэўнага соцыуму і што яе змест залежыць ад эканамічнага, палітычнага, культурнага, рэлігійнага стану грамадства ў канкрэтны перыяд развіцця. (Разглядаемая дэфініцыя ў руска-беларускім слоўніку перакладаецца як вольны час, што не раскрывае яе спецыфікі, таму мы свядома карыстаемся рускамоўным варыянтам.) Абазначым сваё разуменне навуковых катэгорый – дасуг і вольны час, якімі карыстаюцца спецыялісты ў галіне сацыякультурнай дзейнасці. Безумоўна, больш шырокае з іх – вольны час. Гэта дэфініцыя шырока ўвайшла ва ўжытак у XIX ст., калі прамысловая рэвалюцыя і мадэрнізацыя прынеслі разуменне агульнадзяржаўнага значэння такой сацыяльна-эканамічнай катэгорыі, як вольны час, і неабходнасць пошуку новых, эфектыўных, адпавядаючых стану грамадства форм і метадаў яго арганізацыі.

На працягу XIX ст. сфарміравалася рэгламентаваная сістэма працы значнай праслойкі гарадскога насельніцтва, што давала магчымасць выразна акрэсліць вольны час і спрыяла паслабленню тэндэнцыі спантаннага яго правядзення. Невыпадкова ў гэты перыяд з'явіліся масавыя віды спорту, напрыклад футбол ці веласіпедныя гонкі, да арыстакратычных відаў спорту, якім лічыўся раней, да прыкладу, альпінізм, далучаліся розныя колы насельніцтва. Пачынаецца бурнае развіццё ўсіх відаў мастацтва, сярод якіх многімі пачынаюць захапляцца і цікавіцца нават малаадукаваныя групы тагачаснага соцыуму. Для падмацавання сказанага спашлёмся на трапную думку вядомага англійскага даследчыка Н. Дэвіса: «Рэгулярнасць даходаў давала магчымасць па-новаму бавіць вольны час і дасуг: з'явіліся музычныя вечары, сямейныя выхадныя, пешы і горны турызм і спорт – футбол для рабочых і гольф для гаспадароў»[1].

На ўсіх этапах сацыякультурнага развіцця чалавек, нават першабытны, мог выкарыстоўваць пэўны адрэзак часу ў асабістых мэтах, адпаведна сваім магчымасцям і здольнасцям. Сусветная гісторыка-культурная спадчына захоўвае шматлікія прыклады творчага выкарыстання нашымі продкамі вольных хвілін, якія хвалююць і ўзрушаюць нас – прадстаўнікоў тэхнагеннай цывілізацыі. Навукоўцы лічаць, што вынаходніцтва агню

[1] *Дэвис И.* История Европы / пер. с англ. Т. Б. Менской. – М.: АСТ: Транзиткнига, 2004. – С. 572.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыкладна 450–430 тыс. гг. да н. э. дазволіла чалавеку перайсці з царства прыроды ў царства культуры. Нагадаем, што 20–15 тыс. гг. да н. э. (перыяд позняга палеаліту) назіраўся росквіт першабытнага выяўленчага мастацтва ў Заходняй Еўропе, дзе знойдзена больш за 150 пячор з роспісамі першабытных людзей. Да гэтага часу адносяцца знакамітыя роспісы Капавай пячоры на Паўднёвым Урале. Неверагодна праўдападобныя выявы жывёл хутчэй за ўсё не былі самамэтаю першабытных мастакоў і дэманстрацыяй свайго таленту, а жаданнем праз малюнак перадаць супляменнікам упэўненасць у поспеху падчас палявання на магутнага звера і гэтым самым падняць іх баявы дух. Такім чынам, першабытныя мастакі выконвалі пэўную функцыю ў сваім асяроддзі, аднак суаднесці яе з якой-небудзь канкрэтнай функцыяй СКД не прадстаўляецца магчымым, хаця, на наш погляд, прыкметы некаторых, напрыклад відовішчнай ці рэкрэацыйнай, праглядаюцца. Творчасць першабытных мастакоў грунтавалася на прынцыпах ініцыятывы і эмацыянальна-вобразнага ўздзеяння на супляменнікаў.

Калі былі адкрыты фрэскі часоў крыцкай (мінойскай) цывілізацыі, якія датуюцца другім тысячагоддзем да нашай эры, то яны далі магчымасць уявіць, як было арганізавана баўленне вольнага часу, напрыклад, у Кноскім палацы. Фрэскі паказваюць, што ў тыя далёкія часы ўжываліся такія формы, як святочныя шэсці з кветкамі, скрыначкамі; рытуальныя працэсіі, аб чым сведчаць шэсці людзей без сандаляў; спартыўныя гульні, напрыклад акрабатычныя нумары, якія выклікалі бурную рэакцыю гледачоў, і інш. Такім чынам, можна канстатаваць, што гэтыя масавыя мерапрыемствы выконвалі ў пэўнай ступені рэкрэацыйна-відовішчную функцыю і ў аснову іх арганізацыі былі пакладзены прынцыпы добраахвотнасці і агульнадаступнасці, а таксама эстэтызацыі грамадскага жыцця.

Арганізацыю вольнага часу на Крыце можна, на нашу думку, разглядаць як прыклад свецкі, без прыкметнага рэлігійнага ўплыву, у адрозненне ад аналагічных працэсаў у народаў Усходу, якія адбываліся пад відавочным уплывам жрэчаства. Напрыклад, у старажытным Вавілоне жрацамі былі распрацаваны правілы, якія непасрэдна ўплывалі на хамінізацыю асобы і прадугледжвалі засваенне асноў санітарнай гігіены («не есці таго, што праціўна багам, не піць вады з нячыстай пасуды, не падымаць да неба нямытыя рукі і г. д.»), адаптацыю ў соцыуме («забаранялася гаварыць злое, не паважаць бацькоў, не павінавацца начальнікам, вучыць благому») і інш. На наш погляд, сярод народаў старажытнай Месапатаміі падчас правядзення вольнага часу выразна праяўлялася рэкрэацыйна-відовішчная функцыя, галоўным носьбітам якой зноў жа з'яўлялася жрэчаства. На працягу года спраўляліся розныя святы, якія прысвячаліся багатаму ўраджаю ці пэўным падзеям з жыцця багоў, напрыклад іх міфічным шлюбам, ці ваенным перамогам і менш значным падзеям. Падчас гэтых свят фарміравалася святочна-абрадавая культура і мела месца пэўная псіхалагічная разрадка іх удзельнікаў.

Як адзначае ў сваім даследаванні «Падарожжа ў Старажытны Вавілон» нямецкі вучоны Э. Кленгель-Брант, галоўным і самым важным святам лічылася навагодняе, бо тое, што на ім адбывалася, на думку насельніцтва, было вызначальным для існавання дзяржавы. Калі свята па нейкіх прычынах не магло адбыцца, то гэта лічылася ўсеагульнай бядой. Новы год у старажытным Вавілоне святкаваўся ў сакавіку і доўжыўся 10 дзён. Галоўнай дзеючай асобай з'яўлялася статуя бога Мардука, цэнтрам святкавання – храм гэтага бога. Разнастайныя цырымоніі, якія адбываліся на свяце, на думку навукоўцаў, грунтаваліся на традыцыях шумерскай культуры, што існавала амаль за дзве тысячы гадоў да ўзвышэння Вавілона. Навагодняе свята ўключала самыя разнастайныя дзеі: ад упрыгожвання статуі бога Мардука, а потым і іншых багоў золатам, каштоўнымі камянямі да чытання перад багамі малітваў і эпасу аб стварэнні свету з адпаведнымі драматызаванымі дзействамі. Важную ролю ў свяце выконваў цар, які павінен быў скласці перад статуяй бога ўсе атрыбуты сваёй улады і прызнацца ва ўсіх грахах, прычым апраўдаць іх нейкімі непрадбачанымі абставінамі. Атрымаць знакі сваёй улады цар мог толькі пасля таго, як вярхоўны жрэц наносіў яму ўдар па твары, цягаў яго за вушы і наказваў дакладна выконваць усе культавыя правілы (праўда, замест цара ў гэтай унікальнай ролі выступала падстаўная асоба).

Аднак самая важная падзея свята – гэта вызначэнне лёсу дзяржавы на наступны год. Народным навагодняе свята станавілася на 10-ы дзень, калі цар дакранаўся да статуі бога і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прасіў яго падняцца. Статую Мардука вывозілі з горада ў так званы «Дом навагодняга свята», дзе, хутчэй за ўсё, адбываліся драматычныя дзействы па сюжэтах асобных міфаў, якія ўключалі знікненне Мардука з горада разам са злачынцам (апошняга забівалі). А ў горадзе ў гэты час разыгрываліся народныя хваляванні, з неба знікалі сонца і месяц. На пошукі Мардука адпраўлялася яго жонка, і ўрэшце рэшт усё канчалася добра – на радасць усім бог вяртаўся ў Вавілон, значыць, год будзе добры.

Нельга не адзначыць і выразны камерцыйны бок свята, таму што шматлікія вернікі, якія прыходзілі з усёй краіны, рабілі мноства пакупак – ад свяшчэнных сімвалаў да разнастайных тавараў у крамах гандляроў.

Мы дастаткова падрабязна апісалі навагоднее свята ў старажытным Вавілоне з мэтай звярнуць увагу на некаторыя агульныя рысы ў масавых святах больш позняга часу, напрыклад наяўнасць пэўнага сцэнарыя, тэатралізацыі, эканамічнага складніка свята.

Найбольш выразна разуменне мэтавага выкарыстання вольнага часу прадэманстравала Антычнасць. Узровень эканамічнага развіцця полісаў Грэцыі ў пачатку V ст. да н. э. дазволіў сфарміраваць прыкметную праслойку людзей, якія не былі заняты ў вытворчасці і маглі прысвяціць сябе філасофіі, паэзіі, драматургіі і інш. Вынікі гэтай дзейнасці мелі ўплыў на быт і нормы сучаснікаў, прыўнеслі навацыі ў традыцыйную арганізацыю вольнага часу. Можна спаслацца на выснову Фукідзіда аб тым, што грэкі прыдумалі шмат разнастайных форм баўлення вольнага часу, якія давалі асалоду і дапамагалі на нейкі час забыць пра паўсядзённыя клопаты. Гэтыя формы былі як масавыя, так і групавыя. Да першых можна аднесці святы і розныя ўрачыстасці з песнямі, танцамі, звязаныя перш за ўсё з адпраўленнем рэлігійных культаў, да другіх – гутаркі па драматургіі, паэзіі, філасофіі, дэкламацыю. У гэты час пачалі фарміравацца першыя прыкметы асветніцтва, звязаныя, на наш погляд, з развіццём аратарскага мастацтва. Прамоўцы, сярод якіх вядучае месца займалі філосафы, публічна прапагандавалі ідэі дабра і справядлівасці, уцягвалі слухачоў у актыўную дыскусію. Своеасаблівым дэвізам арганізацыі баўлення вольнага часу і ўласнага дасугу сталі радкі з бессмяротнай трагедыі Сафокла «Іфігенія»: «Не сладок плод бесцельного досуга, и праздному не помогает бог».

Найбольш выразна дасягненні Антычнасці праявіліся ў Афінах класічнага перыяду. Перш за ўсё гэтаму садзейнічала вялікая перамога маленькага поліса над магутным ворагам – персамі. Менавіта да гэтай падзеі, мяркуем, можна аднесці выказванне акадэміка Д. С. Ліхачова, што гісторыя культуры чалавецтва ведае перыяды асабліва светлага погляду на сусвет, перыяды як бы здзіўлення ім, калі захапленне акаляючым светам становіцца свайго роду рысай светапогляду і эстэтычнага светаўспрымання. Звычайна гэта перыяды з'яўлення новага вялікага стылю ў мастацтве і ў літаратуры. Новае тлумачэнне свету нясе з сабой і новае яго адкрыццё. У Афінах класічнага перыяду змест і характар правядзення вольнага часу ўзбагаціліся праз далейшае ўдасканаленне сістэмы адукацыі і развіццё ўсіх відаў мастацтва. На Акропалі паўстае цудоўны храмавы ансамбль – культурны цэнтр не толькі Атыкі, але і іншых полісаў. З развіццём драматычнай паэзіі пачынаецца будаўніцтва тэатраў. Разумеючы іх значэнне для фарміравання поліснага патрыятызму і мэтанакіраванай арганізацыі вольнага часу, улады нават плацілі маламаёмным жыхарам, каб тыя маглі наведваць тэатр.

Галоўным зместам масавых форм вольнага часу ў антычным грамадстве было адпраўленне культаў, што адлюстроўвала яго духоўныя і эстэтычныя каштоўнасці. Навукоўцы адзначаюць, што пралогі свят заўсёды насілі палітычны і грамадскі характар, прадугледжваўся абавязковы ўдзел ганаровых гасцей і герояў войн. У якасці, на наш погляд, выразнага прыкладу нагадаем масавае свята, якое адбывалася раз у чатыры гады і прысвячалася багіні мудрасці і ведаў – Афіне. Урачыстая працэсія з найбольш знатных і доблесных грамадзян горада падносіла багіні тканае, аздобленае багатай вышыўкай свяшчэннае пакрывала – пеплас, на якім былі выявы барацьбы багоў з гігантамі. У працэсіі ўдзельнічалі ўсе жыхары. Ішлі дзяўчаты ў белым прасторным адзенні з сасудамі для ахвяраванняў, ішлі барадатыя жрацы і юныя служкі, паважаныя старцы з сімваламі міру – аліўкавымі галінкамі, флейтысты, коннікі, пагоншчыкі ахвярных быкоў. Ішлі так, каб адусюль бачыць Парфенон.

З такімі ж урачыстасцямі адкрываліся Алімпійскія гульні ў Старажытнай Грэцыі, і шмат якія рытуалы ўспрыняты арганізатарамі сучасных Алімпійскіх гульняў, напрыклад

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

парадныя шэсці спартсменаў, запальванне алімпійскага агню, клятва алімпійцаў, суддзяў, урачыстыя ўзнагароды пераможцаў і інш.

Пры правядзенні вольнага часу ў Старажытнай Грэцыі як адзін з відаў масавых свят можна разглядаць мастацка-вобразны рытуал, прысвечаны сельскагаспадарчай працы, асабліва святкаванне Вялікіх Дыянісій, падчас якіх адбываліся карнавальныя шэсці з дарамі прыроды, выступленні хору, тэатралізаваныя дзействы, узнагароды лепшых.

Такім чынам, мы можам канстатаваць, што прыведзеныя прыклады розных форм арганізацыі вольнага часу ў элінскіх полісах адлюстроўваюць пашырэнне функцый сацыякультурнай дзейнасці: ад адукацыйна- развіваючай і інфарматыўна-асветніцкай да пераўтваральна-творчай. Безумоўна, формы сацыякультурнай дзейнасці ўключалі і функцыі, аб якіх гаварылася раней, аднак магчымасці дадзеных разнастайных форм былі на парадак вышэй, чым у больш старажытных цывілізацыях, тым больш што і прынцыпы, закладзеныя ў аснову арганізацыі вольнага часу, у грэчаскіх полісах былі значна больш дакладнымі: назавём прынцыпы развіцця ініцыятывы і самадзейнасці, дыферэнцыяцыі ідэйна-эмацыянальнага ўздзеяння на розныя групы і інш.

Адначасова з архаічным перыядам у гісторыі Старажытнай Грэцыі (VIII ст. да н. э.) пачынае развівацца гісторыя Старажытнага Рыма, спачатку таксама архаічнага, потым Рымскай рэспублікі, а затым імперыі. Пытанне аб суадносінах і ўзаемаўплыве дзвюх цывілізацый Антычнасці нават на сённяшні дзень падаецца спрэчным. Адны навукоўцы схільны лічыць рымскую цывілізацыю вытворнай ад элінскай, другія, наадварот, разглядаюць яе як самастойную. У межах артыкула ўстаранімся ад навуковых дыскусій. Адзначым толькі, што для раздробненай на асобныя полісы Старажытнай Грэцыі масавыя святы набывалі агульнаэлінскае значэнне як сведчанні культурнага адзінства грэкаў, таму што прысвячаліся канкрэтнаму бажаству з агульнага пантэона багоў. Наадварот, Старажытны Рым імкнуўся прадэманстраваць сваю ваенную моц, угрунтаваць гэтае ўяўленне сярод насельніцтва Рыма, таму не выпадкова праводзіліся грандыёзныя ваенныя трыумфы, чаго не ведае сацыякультурнае жыццё Старажытнай Грэцыі. Выкарыстаем у якасці прыкладу арганізацыю аднаго з масавых свят у Старажытным Рыме, якое ў Старажытнай Грэцыі ніколі не адбывалася, – так званы «трыумф», больш дакладна – апісанне «трыумфу», арганізаванага ў гонар пераможцаў і перамогі Карфагена (II ст. да н. э.).

…Легіёны, якія вярнуліся з Афрыкі, выстраіліся за межамі горада – на Марсавым полі. На парадных шлемах чорныя і чырвоныя пёры. Палкаводзец Публій Сцыпіён Эміліян Афрыканскі абыходзіць строй, побач ідзе цэнтурыён з плоскім залатым блюдам, на якім ляжаць розныя залатыя прадметы – ганаровыя ўзнагароды найбольш услаўленым легіянерам. Потым Сцыпіён садзіцца ў калясніцу, запрэжаную чацвёркай белых коней, ён апрануты ў пурпурную тогу, вытканую залатымі пальмавымі лістамі, у правай руцэ – скіпетр, у левай – лаўровая галінка. На калясніцы трон са слановай косці, які з гэтай нагоды ўзялі з храма Юпітэра Капіталійскага. Лічыцца, што і калясніца, і тога, і трон належаць самому Юпітэру, а хто так апрануты і ўшанаваны, – карыстаецца такой жа ўладай, як і Юпітэр. Раб на запятках калясніцы крычыць: «Агляніся!» – а там прывязаны звон і біч як своеасаблівы напамін, што лёс пераменлівы. Пад гукі труб праходзяць войскі і спяваюць салдацкія песні. Яны маюць права сказаць палкаводцу ўсё, што аб ім думаюць. Працэсія ўступае ў горад, наперадзе ідуць консулы, прэтары і прадстаўнікі іншых службовых пасад…

Апісанне «трыумфу» настолькі выразнае, што наводзіць на паралелі з ваеннымі парадамі сучаснасці – шмат агульнага ў гэтых дзействах, нягледзячы на розніцу больш чым у тысячу гадоў. Разам з тым відавочна, што кожная старажытная цывілізацыя зрабіла свой адметны ўнёсак у падмурак сацыякультурнай галіны, што дазваляе ў некаторай ступені дыферэнцыраваць культурныя асяроддзі, знаходзіць характэрныя для яе рысы праз асаблівае ў арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці.

Такім чынам, адзначым, што прыведзеныя звесткі паказваюць зараджэнне розных форм сацыякультурнай дзейнасці, яе функцый і прынцыпаў у глыбокай старажытнасці, таму што ўсе яе праявы былі абумоўлены маральна-інтэлектуальнымі матывамі, адпавядаючымі стану тагачаснага грамадства. Ад старажытных часоў да нас дайшлі прыклады захавання культурных каштоўнасцей, скажам бібліятэкі Ашурбанапала; сцвярджэння значнасці культурных здабыткаў сярод насельніцтва праз масавыя мерапрыемствы, тэатральныя пастаноўкі, філасофскія дыспуты; далейшага развіцця

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каштоўнасцей культуры дзякуючы тагачаснай адукацыі і высілкам інтэлектуалаў старажытнасці.

*M. BYASPALAYA*

**SOCIO-CULTURAL ACTIVITY IN A HISTORICAL RETROSPECTION**

The correlation of the notions spare time, leisure activity and rest are interesting to us first of all with the fact of their definitions' connections, notably the socio-cultural activity as the means of spending the time as a whole or the organization of leisure by the socio-cultural means or just the means of the recreation of the personality through the rest. The aim of the article is the reflection of various forms of socio-cultural activity's origin on the example of culture environment of the ancient world.

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 03.10.2011.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ